Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні, 17-я па ліку, адбудуцца 22—23 красавіка. Штогадовая навуковая канферэнцыя з'яўляецца галоўнай пляцоўкай краіны для абмеркавання вынікаў навуковых даследаванняў і дасягненняў па пытаннях кніжнай культуры, спрыяе наладжванню дыялогу і супрацоўніцтва паміж даследчыкамі розных краін. Сярод тэм для абмеркавання — рукапісная кніжнасць Беларусі, сучасная беларуская кніга, гістарычныя бібліятэкі і развіццё бібліятэчнай справы, улік і апісанне кніжных помнікаў, кніга ў сучасным сацыякультурным і інфармацыйным асяроддзі, асобы беларускага кнігазнаўства. Арганізатары канферэнцыі — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Як паведамляецца на сайце кніжніцы, сустрэчы пройдуць у будынку ўстановы. Будзе таксама магчымасць дыстанцыйнага ўдзелу з тэкстам даклада, відэадакладам альбо дакладам-прэзентацыяй.